23 лютага — Дзень Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту




ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 5 (492) | Субота, 20 лютага 1982 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

## НА ВЫТВОРЧАЙ НАРАДЗЕ

Пазаўчора ў актавай зале адбылася вытворчая нарада прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоўнікаў універсітэта. На ёй абмеркаваны задачы калектыву ГДУ ў святле рашэнняў лістападаўскага (1981 г.) Пленума ЦК КПСС. З дакладам выступіў старшыня мясцовага камітэта універсітэта **М. Н. Мурашка**. У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел прарэктар па навуковай рабоце **М. В. Навучыцель,** старшыні прафбюро: фізічнага факультэта — **І. І. Старун,** геалагічнага — **Л. Д. Мядзведзеў,** лабарант кафедры фізвыхавання **А. А. Косцікаў,** намеснік старшыні прафбюро эканамічнага факультэта **Э. І. Лізарава,** старшыня культурна-масавай камісіі мясцкома **У. А. Баркоў**, галоўны бухгалтар універсітэта **І. А. Курава.** З паглыбленай цікавасцю было выслухана выступленне рэктара ГДУ акадэміка АН БССР **Б. В. Бокуця.** Па абмеркаванаму пытанню прынята разгорнутая пастанова.

На вытворчай нарадзе па дакладу намесніка старшыні мясцкома, старшыні вытворчай камісіі **Ю. А. Кашына** прыняты павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы калектыву універсітэта на 1982 год па дастойнай сустрэчы 60-годдзя СССР. Уручаны пераходны Чырвоны сцяг, вымпелы, ганаровыя граматы пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва за 1981 год.

Справаздача аб вытворчай нарадзе будзе надрукавана ў наступным нумары нашай газеты.

## НА ЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЯХ

Традыцыйнае свята — Дзень Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту — супадае сёлета з гадавінай пачатку работы гістарычнага XXVI з'езда КПСС, рашэнні якога натхняюць савецкіх людзей на новыя здзяйсненні.

Падводзячы вынікі першага года адзінаццатай пяцігодкі, працоўныя калектывы, арганізацыі абароннага таварыства, імкнуцца выйсці на новыя рубяжы ў юбілейны для нашай краіны год.

Каб унесці дастойны ўклад у справу далейшага ўмацавання абароннай магутнасці Радзімы, пярвічная арганізацыя ДТСААФ нашага універсітэта прыняла павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы, стала ініцыятарам спаборніцтва на лепшую пастаноўку ваенна-патрыятычнай работы сярод ВНУ рэспублікі. Для паспяховага выканання абавязацельстваў у нас ёсць усе магчымасці. Доказам гэтаму з'яўляюцца вынікі мінулагодняга агляду-конкурсу абаронна-масавай і ваенна-патрыятычнай работы, у якім ГДУ заняў першае месца сярод ВНУ рэспублікі.

Лепшымі па пастаноўцы работы ў гэтым напрамку сталі факультэт фізічнага выхавання, эканамічны, фізічны і гісторыка-філалагічны факультэты.

Вялікая заслуга ў гэтым камсамольскіх бюро факультэтаў і адказных за ваенна-патрыятычную работу Леаніда Шапавалава, Алега Рымашэўскага, Міхаіла Сергіенкі, Віктара Яцухны.

За апошнія гады ў нас склаліся добрыя традыцыі па актывізацыі абаронна-масавай і ваенна-патрыятычнай работы. Гэта сустрэчы і вечары з удзелам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, штогадовыя паходы студэнтаў па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы Гомельшчыны, напісанне летапісу баявой славы, работа па вывучэнню і ахове помнікаў гісторыі і культуры, аказанне дапамогі сем'ям загінуўшых воінаў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. У дні памятных дат у студэнцкім парку праходзяць мітынгі, на якіх ветэраны вайны, расказваюць моладзі аб гераічным мінулым нашага народа.

Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца Зорныя паходы студэнтаў ГДУ, якія праводзяцца кожны год ў дні месячніка абаронна-масавай работы. У час іх прадстаўнікі ўсіх факультэтаў на чале з актывістамі ДТСААФ сустракаюцца з жыхарамі раёнаў, праз якія праходзяць маршруты Зорнага паходу, чытаюць лекцыі, праводзяць гутаркі на міжнародныя і ваенна-патрыятычныя тэмы, аказваюць дапамогу школам, калгасам і саўгасам у пастаноўцы ваенна-патрыятычнай работы.

Вялікі ўклад у справу выхавання моладзі ў духу патрыятызму ўносяць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, якія працуюць у нашым універсітэце: У. В. Анічэнка, У. Д. Арэшчанка, А. А. Баскакаў, Г. С. Мільчанка, П. А. Савінскі, І. А. Ільіных, Я. Р. Ермалаеў, Я. А. Семянчук, У. С. Сідараў, А. А. Косцікаў, П. А. Дуброўскі, А. С. Калугін, В. А. Хількевіч, М. В. Шалухін і інш.

Патрыятычнае выхаванне студэнтаў спалучаецца з развіццём тэхнічных і ваенна-прыкладных відаў спорту, масавай здачай норм ГПА. Многія нашы спартсмены павысілі сваё майстэрства, сталі кандыдатамі ў майстры спорту, першаразраднікамі. Неаднаразова яны з поспехам абаранялі гонар Цэнтральнага раёна, вобласці на розных спаборніцтвах.

Пры пярвічнай арганізацыі ДТСААФ працуе 8 секцый і гурткоў па ваенна-прыкладному спорту, у якіх займаюцца звыш 500 чалавек.

Павышэнне эфектыўнасці і якасці ваенна-патрыятычнай і абаронна-масавай работы, паспяховае выкананне ўзятых сацыялістычных абавязацельстваў будзе нашым лепшым падарункам юбілею Радзімы — 60-годдзю ўтварэння СССР.

**У. КОЎШ,**
старшыня камітэта ДТСААФ.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На мінулым тыдні адбылося чарговае пасяджэнне Савета універсітэта. Абмеркаваны шэраг актуальных пытанняў. Першым было заслухана паведамленне загадчыка праблемнай навукова-даследчай лабараторыі фізіка-хімічных працэсаў трэння дацэнта У. М. Старыкава аб ходзе праводзімых у ёй навукова-даследчых работ. На Савеце вызначаны меры па паляпшэнню даследаванняў ў гэтай лабараторыі.

Аб падрыхтоўцы кадраў на кафедры педагогікі і псіхалогіі зрабіў паведамленне яе загадчык член-карэспандэнт АПН СССР І. Ф. Харламаў.

Аб выніках зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі членаў Савета праінфармавала начальнік вучэбнага аддзела Н. І. Папкова.

Па пытанню ўвядзення заняткаў па фізічнаму выхаванню на старэйшых курсах універсітэта выступіў загадчык кафедры фізічнага выхавання дацэнт В. А. Каляда.

На пасяджэнні Савета зацверджаны мерапрыемствы па вывучэнню кнігі Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева «Успаміны». Па гэтаму пытанню выступіў загадчык кафедры гісторыі КПСС дацэнт А. П. Мяшчэрскі.

Разгледжаны рэкамендацыі факультэтаў і зацверджаны імянныя стыпендыі для лепшых студэнтаў універсітэта на другі семестр бягучага навучальнага года.

На пасяджэнні Савета выбраны на вакантныя і перавыбраны на займаемыя пасады прафесарска-выкладчыцкі састаў.

## УДАСТОЕНЫ ІМЯННЫХ СТЫПЕНДЫЙ

За выдатную вучобу, актыўную грамадскую дзейнасць па прадстаўленню дэканатаў і грамадскіх арганізацый факультэтаў Савет універсітэта прызначыў на другі семестр бягучага навучальнага года Ленінскія стыпендыі: **Алене ГАЙДУКОВАЙ** — студэнтцы 4-га курса гістфіла, **Генадзю БАЙКАЧОВУ** і **Наталлі АСМАЛОЎСКАЙ** — чацвёртакурснікам матэматычнага факультэта, **Аляксею НІКІФАРАВУ** — студэнту 4-га курса эканамічнага факультэта, **Міхаілу СЕРГІЕНКУ** — студэнту 4-га курса і **Наталлі ФЕДАРАВАЙ** — студэнцы трэцяга курса фізічнага факультэта, пяцікурсніцы біялагічнага факультэта **Людміле МЕДЗІНАЙ.**

Стыпендыі імя Янкі Купалы ўдастоена пяцікурсніца гістфіла **Алена СУЛЕЙКА.**

*У парткоме*

## БОЛЬШ КЛОПАТАЎ АБ МАЛАДЫХ

На чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта універсітэта, якое адбылося ў мінулую сераду, асноўным на парадку дня было пытанне аб рабоце партыйных арганізацый гісторыка-філалагічнага і фізічнага факультэтаў з маладымі камуністамі. Заслуханы выступленні сакратароў партыйных бюро: гістфіла — М. В. Гусевай, фізічнага факультэта — М. В. Максіменкі. Садаклад зрабіў намеснік сакратара парткома Я. А. Семянчук. Разам са станоўчым у рабоце пярвічных партыйных арганізацый з маладымі камуністамі адзначаны і маючыя месца недахопы. У прыватнасці, яшчэ не ўсе маладыя камуністы маюць пастаянныя даручэнні, некаторыя з кандыдатаў і членаў КПСС не паказваюць прыклад у вучобе і грамадскай дзейнасці. Да апошняга часу не была наладжана партыйная вучоба з маладымі камуністамі і кандыдатамі ў члены КПСС.

Прынятая пастанова накіравана на павышэнне авангарднай ролі маладых камуністаў у сваіх калектывах, ухіленне адзначаных на пасяджэнні парткома недахопаў.

## КАМУНІСТАМ ПАКАЗВАЦЬ ПРЫКЛАД

На чарговым партыйным сходзе гісторыка - філалагічнага факультэта абмеркавана пытанне аб рабоце яго камсамольскай арганізацыі ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС. З дакладам выступіў сакратар камсамольскага бюро гістфіла Анатоль Шэвель. Ён падрабязна ахарактарызаваў усе бакі шматграннай дзейнасці камсамольцаў факультэта. Іх работа асабліва актывізавалася ў сувязі з падрыхтоўкай да прадстаячага XIX з'езда ВЛКСМ. За апошні час гістфілаўцамі праведзена шмат цікавых масавых мерапрыемстваў.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел партгрупорг групы Г-41 Галіна Салаўёва, маладыя камуністы Таццяна Кудрашова з групы Р-32, стараста групы БР-12 Пётр Жураў, член партбюро У. І. Коваль, які адказвае за работу камсамольскай арганізацыі факультэта, старшы куратар С. П. Емяльянава, старшы куратар інтэрнатаў Л. Ф. Кахоўская. У выступленнях адзначалася ўзросшая актыўнасць і плённасць працы камсамольскай арганізацыі факультэта. Разам з тым указвалася на пасіўнасць асобных маладых камуністаў у рабоце камсамольскай арганізацыі.

Прынятая на сходзе пастанова нацэльвае камсамольцаў гістфіла на далейшую актывізацыю ўсёй работы, дастойную сустрэчу камсамольскага форуму краіны.

(Наш кар.).




# МЕРАПРЫЕМСТВЫ

## КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГДУ ПА ДАСТОЙНАЙ СУСТРЭЧЫ XIX З'ЕЗДА ВЛКСМ

Весці сацыялістычнае спаборніцтва паміж камсамольцамі універсітэта за права падпісаць рапарт XIX з'езду ВЛКСМ. (Люты — красавік).

Вывучыць матэрыялы лістападаўскага (1981 г.) Пленума ЦК КПСС, працягваць вывучэнне матэрыялаў XXVI з'езда КПСС. — (Люты — красавік).

Правесці агульнауніверсітэцкі агляд-конкурс «XIX з'езду ВЛКСМ — 19 ударных тыдняў», прысвечаны XIX з'езду ВЛКСМ.

Правесці агляд-конкурс сярод камсамольскіх арганізацый факультэтаў і інтэрнатаў універсітэта на лепшае афармленне нагляднай агітацыі, прысвечанай XIX з'езду ВЛКСМ. — (Сакавік).

Распрацаваць тэматыку лекцый, прысвечаную XIX з'езду ВЛКСМ, арганізаваць чытанне лекцый камсамольцамі і членамі школы маладога лектара ў калектыве ГДУ, сярод насельніцтва г. Гомеля. — (Люты — сакавік).

Шэфскаму сектару камітэта камсамола правесці ў падшэфных школах, прафтэхвучылішчах і домакіраўніцтвах навукова-тэарэтычныя канферэнцыі па прамове У. І. Леніна на III з'ездзе РКСМ. — (Сакавік).

Штабу працоўных спраў універсітэта разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж лінейнымі і занальнымі студэнцкімі атрадамі, прысвечанае XIX з'езду ВЛКСМ. — (Люты — красавік).

Правесці навукова-практычную канферэнцыю на базе гісторыка-філалагічнага факультэта «Летапіс народнай славы Цэнтральнага раёна г. Гомеля» — (Красавік).

Клубу мастацкай самадзейнасці універсітэта выступіць з тэматычнымі канцэртамі, прысвечанымі XIX з'езду (па асобнаму графіку). Правесці конкурс камсамольскай песні, прысвечаны камсамольскаму форуму. — (Красавік).

Правесці ў вучэбных групах і студэнцкіх інтэрнатах сустрэчы з ветэранамі камсамола, вайны і працы, гутаркі за «круглым сталом», прысвечаныя XIX з'езду ВЛКСМ. — (Сакавік — красавік).

Правесці агульнауніверсітэцкі лыжны крос, прысвечаны XIX з'езду ВЛКСМ.— (Сакавік).

Правесці камсамольска-маладзёжны суботнік, прысвечаны XIX з'езду ВЛКСМ.— (Красавік).

Абмеркаваць на пасяджэнні камітэта камсамола вынікі падрыхтоўкі і сустрэчы XIX з'езда ВЛКСМ — (Красавік).

**МЕРАПРЫЕМСТВЫ АБМЕРКАВАНЫ І ПРЫНЯТЫ НА ПАСЯДЖЭННІ КАМІТЭТА ЛКСМБ ГДУ.**

*У мастацкіх калектывах*

# «ЧЭРПАЕМ З БАГАЦЦЯЎ НАШАГА НАРОДА»

Наша газета ўжо паведамляла, што вакальна-інструментальны ансамбль «Радзімічы» стаў лаўрэатам прэміі камсамола Гомельшчыны. Такая высокая ацэнка заслуг маладзёжнага музычнага калектыву — гэта вынік шматгадовай упартай працы над удасканаленнем майстэрства, над выпрацоўкай густу свайго і слухачоў, пошук уласнага твару. Нядаўна калектыў вярнуўся з творчай паездкі на Украіну, дзе ён быў госцем Днепрапятроўскага універсітэта і прымаў удзел у тыдні дружбы.

Мастацкі кіраўнік вакальна-інструментальнага ансамбля «Радзімічы» Мікалай Уладзіміравіч Казароз і дацэнт факультэта фізічнага выхавання **Уладзіслаў Аляксеевіч Баркоў**, які прымаў удзел у паездцы на Украіну, днямі мелі размову з карэспандэнтам нашай газеты.

**— Мікалай Уладзіміравіч, раскажыце крыху, калі ласка, аб Вашым калектыўным творчым крэда, аб тым, што для Вас служыць узорам, дастойным пераймання?**

— Гэта пытанне зусім не новае для мяне і нават вельмі чаканае. Зразумела, што кожны самадзейны мастацкі калектыў мае свае сімпатыі і прыхільнасці. Ёсць яны і ў нас: «Песняры». Гэты ансамбль вось ужо шмат гадоў вызначаецца высокай музычнай культурай, самым старанным падборам рэпертуару. Аўтарытэт ансамбля трывалы. Гэта даказвае той факт, што за гады існавання «Песняроў» узнікалі шумныя, стракатыя, з прэтэнцыёзнымі назвамі «ансамблі», «групы» і... знікалі невядома куды. Тлумачыцца гэта тым, што існуюць такія «ансамблі» на першай хвалі свайго энтузіязму і цікаўнасці слухачоў да новага. Потым пачынаецца паўтарэнне, зніжэнне цікавасці да іх, а пошук не прыносіць поспеху. «Песняры» ж моцныя сваімі карэннямі — фальклорам, самабытнай народнай творчасцю. Народныя матывы, песні ў аранжыроўцы гэтага ансамбля жывуць дзесяцігоддзямі. А гэта ўласціва толькі лепшым песенным узорам — песням Дунаеўскага, Багаслоўскага, Салаўёва-Сядога...

Вось так імкнемся працаваць і мы: чэрпаць з крыніцы музычных багаццяў нашага народа. Прычым, адразу скажу, што не бачу нічога дрэннага ў пераймацні, калі гэта робіцца з лепшых, высокамастацкіх узораў, не разумею тых, хто настойліва падкрэслівае сваю поўную самастойнасць. Для самадзейнага калектыву гэта, практычна, немагчыма.

**— Як вядома, удзел у тыдні дружбы ў Днепрапятроўску стаў традыцыйным для Вашага ансамбля. Чым адметнай была паездка гэтага года, як Вы да яе рыхтаваліся?**

— Так, менавіта, традыцыйны. Шосты раз у гэтым годзе мы былі гасцямі горада на Дняпры. І вазьму на сябе смеласць сказаць, што гасцямі жаданымі. Гэта адчувалася па цеплыні сустрэчы, прыёму ў час нашых выступленняў. Рыхтуемся мы да гэтай паездкі заўсёды з пачуццём вялікай адказнасці: мы ж прадстаўнікі сваёй рэспублікі, прадстаўнікі нашага беларускага мастацтва. У адпаведнасці з гэтым складаем і рэпертуар. Прычым, з кожным годам надаём усё большае значэнне і большае месца беларускай народнай, беларускай сучаснай песні. Калі раней рэпертуар наш складаўся наступным чынам: прыкладна 40 працэнтаў усёй праграмы было аддадзена беларускай песні, то цяпер гэты працэнт узрос да 80. Гэта тлумачыцца і тым, што я гаварыў раней — карэнні нашы ў фальклоры, у народнай творчасці, — і тым, што цікавасць да беларускай песні ўзрасла велізарна. Гэта і не дзіўна: у яе такія выдатныя прапагандысты — «Песняры», «Верасы»! Асабліва адчулі мы гэта на Украіне, дзе адносіны да беларускай песні, нашага мастацтва наогул, любоўныя і, не пабаюся гэтага слова, трапяткія.

Часу для падрыхтоўкі, на жаль, было да крыўднага мала: ён супаў з сесіяй. Выручае нас у такіх выпадках вялікае пачуццё ўзаемаразумення, дружбы, захапленне музыкай. Тое, як нас прымалі ў Днепрапятроўску, дае мне падставу меркаваць, што ўсё гэта прыносіць свой плён. Вось адна з нашых песень — «Чаканне». Словы яе напісаў удзельнік нашага ансамбля Сяргей Бялоў. Клалі іх на музыку ўсе разам, на адной з рэпетыцый. Адначасова рэдагавалі словы. Так што песня стала нашым агульным творам. Яна спадабалася ўкраінскім сябрам. Гэта адчувалася па апладысментах, па водгуках удзельнікаў іншых самадзейных ансамбляў — гасцей тыдня дружбы.

Цёпла прымалі і іншыя нашы лепшыя нумары: беларускую народную песню «Ульяніца» ў апрацоўцы нашага калектыву, песню Ігара Лучанка «Зачараваная»...

**— А цяпер, калі ласка, крыху аб самім тыдні.**

Праходзіў ён з 7 па 12 лютага і быў прысвечаны ўсенароднаму святу — 60-годдзю ўтварэння СССР. Днепрапятроўскі універсітэт, яго вакальна-інструментальны ансамбль «Дняпране» зрабілі ўсё магчымае для таго, каб госці тыдня адчувалі сябе добра. У тыя дні ў Днепрапятроўск з'ехаліся ВІА Харкаўскага і Кіеўскага універсітэтаў, Гомельскага політэхнічнага інстытута і інш. Трэба адзначыць дакладную арганізацыю рабочай і культурнай праграм. Канцэрты ішлі штодзённа ў дзвюх залах: культурна-бытавога комплексу універсітэта і Палаца культуры студэнтаў імя Ю. А. Гагарына. Адзнакай нашых выступленняў былі Ганаровыя граматы — рэктарата і грамадскіх арганізацый універсітэта, кіраўніцтва Палаца культуры студэнтаў. Узнагароджаны імі ансамбль «...за актыўны ўдзел у VII тыдні дружбы ВНУ краіны, прысвечаным 60-годдзю ўтварэння СССР, і высокае выканаўчае майстэрства».

У рамках культурнай праграмы мы наведалі музеі горада, дыяраму Дняпроўскай бітвы, усклалі кветкі да помніка-стэлы студэнтам Днепрапятроўска, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне. Былі экскурсіі па гораду, знаёмства з універсітэтам, вечары адпачынку ў дыскатэках маладзёжных клубаў.

**— У кожнага растучага калектыва ёсць свае цяжкасці, праблемы, планы. Што хвалюе Ваш калектыў сёння?**

— Сапраўды, праблем шмат. Частка іх паспяхова вырашаецца. Так, напрыклад, нядаўна набыты новыя музычныя інструменты для ансамбля. Увесь апошні час мы працавалі над эскізамі касцюмаў. Цяпер у нас будзе два камплекты. Асабліва хвалявалі нас беларускі. Колькі ўзораў нацыянальнага адзення мы пераглядзелі! Угляданіся ў арнамент, дэталі, крой, колеры і адценні. Пасля шматлікіх нарад і спрэчак узор канцэртнага адзення выпрацаваны і яно шыецца.

Але ўсё гэта, так сказаць, практычны бок справы. Галоўным жа для нас па-ранейшаму застаецца ўдасканаленне выканаўчага майстэрства, пошук новых яго форм. Асаблівы сэнс для нас гэта набыло цяпер, калі ансамбль удастоены высокай узнагароды — прэміі камсамола Гомельшчыны. Аказацца дастойнымі такой высокай ацэнкі — наша першачарговая задача.

Пытанне да Уладзіслава Аляксеевіча Баркова:

**— Вашы ўражанні аб тыдні дружбы, аб выступленні «Радзімічаў» перад украінскімі сябрамі?**

— У час нашага знаходжання ў Днепрапятроўску стаялі марозныя дні. Аднак гасціннасць нашых гаспадароў саграваIа нас усюды, дзе б мы ні знаходзіліся. Беларускіх і ўкраінскіх студэнтаў аб'ядноўвае магутная сіла — любоў да песні. Прыемна было чуць у выкананні «Дняпран» беларускія народныя песні, якія яны ўключылі ў свой рэпертуар пасля наведання нашага горада. У той жа час і нашы студэнты выконвалі ў канцэртах украінскія песні. Гледачы вельмі цёпла прымалі выступленні «Радзімічаў». На прафесіянальным узроўні вёў канцэрт Аляксандр Лысянкоў. Нікога не пакідалі раўнадушным пантамімы Міхаіла Каняхіна.

Гэта сустрэча яшчэ больш умацавала дружбу паміж нашымі універсітэтамі.

**Гутарку вяла М. ШЫМАНОЎСКАЯ.**



**НА ЗДЫМКУ: самадзейныя артысты ВІА «Радзімічы» ў час знаходжання ў Днепрапятроўску.**

Фота **У. Баркова.**

# Наведалі ГДР

Штогодна лепшым байцам будаўнічых атрадаў універсітэта прадастаўляецца права ўдзельнічаць у турыстычных паездках па нашай краіне і за яе межамі. На гэты раз такі гонар выпаў Алегу Рымашэўскаму, Але Врублеўскай і мне. ЦК ВЛКСМ даў магчымасць вялікай групе студэнтаў — 17 прадстаўнікоў Гомельскай вобласці, 16 — Віцебскай і тры прадстаўнікі рэспубліканскага штаба СБА — наведаць Германскую Дэмакратычную Рэспубліку.

Дванаццаць дзён, якія мы правялі ў гэтай краіне, далі нам дакладнае ўяўленне аб жыцці яе народа, аб тым, як ідзе будаўніцтва сацыялістычнага грамадства. І, самае галоўнае, мы набылі шмат новых сяброў — гэта рабочыя прадпрыемстваў, дзе мы пабывалі з дружалюбнымі візітамі, студэнты вышэйшых навучальных устаноў.

Вялікае ўражанне на кожнага з нас зрабілі гарады, якія мы наведалі. Пачаць хочацца з Бухенвальда. Яго назва, месца, дзе размяшчаўся канцэнтрацыйны лагер, сталі напамінкам жорсткасці азвярэлых фашысцкіх вылюдкаў. Выконваючы запавет выдатнага чэшскага гуманіста Юліуса Фучыка «Людзі, будзьце пільныя!», кожнаму трэба бачыць такія месцы, каб адчуць атмасферу жудаснага здзекавання над людзьмі.

У Дрэздэне, Патсдаме, Эрфурце, Берліне мы любаваліся выдатнымі архітэктурнымі помнікамі розных эпох, наведвалі музеі. Гётэўскай паэзіяй да гэтага часу дыхае Веймар, дзе знаходзіцца дом-музей вялікага паэта і філосафа.

**Алег ДЗЕМІДЗЕНКА,**
**студэнт пятага курса эканамічнага факультэта.**

